УДК: 94(476) +94(470+571)+327

# АДНОСІНЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА МАСКОЎСКАГА Ў 1494–1500 ГГ.

***Алег Сахончык, Аляксей Барнюк***
*Мінск, Беларусь*

Данная статья посвящена анализу взаимоотношений Великого Княжества Литовского и Великого Княжества Московского в период 1494-1500 гг. Наибольший интерес представляет ситуация на границе, которая образовалась после подписания «вечного докончанья» 5 февраля 1494 г. Можно сказать, что пограничные конфликты были бессистемными и локальными по своему уровню. Исключением стал 1498 год, в котором происходит самый пик конфронтации. Однако в 1499 г. замечается упадок активности на границе. Таким образом пограничные конфликты вносили дестабилизирующий фактор в отношениях государств, но не были причиной войны 1500-1503 гг.

***Ключавыя словы: Вялікае Княства Літоўскае, Вялікае Княства Маскоўскае, памежжа, канфлікты, дыпламатыя, мірная дамова 1494 г.***

Перыяд з 1494 па 1500 гг. -- час, калі паміж Вялікім Княствам Літоўскім (далей ВКЛ) і Вялікім Княствам Маскоўскім (далей ВКМ) былі афіцыйна мірныя адносіны. У лютым 1494 г. было падпісана “вечное докончание” [3, С. 329–323]. Адносіны ВКЛ і ВКМ можна падзяліць на пэўныя перыяды. Намі было выдзелена тры перыяды.

Першы перыяд быў з 1494 – па 1495 гг. Адносіны паміж дзяржавамі ў гэты час носяць мірны характар. Значная частка перамоў у 1494 г. была прысвечана пытанню аб шлюбе вялікага князя літоўскага Аляксандра і дачкі Івана ІІІ, Алены [7, С. 138–144, 157]. Вынікам перамоў стаў прыезд паслоў ВКЛ у Маскву, у студзені 1495 г. [7, С. 159–172]. Вырашаліся пытанні вяртання палонных, якіх схапілі падчас вайны 1486–1494 гг. Праўда, праблема вяртання маёмасці станоўча не была вырашана [7, с. 144, 157]. Памежныя канфлікты па свайму характтару былі лакальнымі. Паміж прадстаўнікамі рода Мезецкіх адбываліся сутыкненні [7, С. 147–148, 195]. У дадзеным выпадку трэба бачыць не парушэнне дагавора 5 лютага 1494 г., у якім было напісана, што “… и те князи в Мезоцку в городе и волостях ведают свои долницы отчины свои…”, а хутчэй лагічны вынік кампраміснай палітыкі, калі прадстаўнікам аднаго роду дазволілі служыць розным гаспадарам і пры гэтым захоўвалася агульнае трыманне “дольницы” [3, с. 330]. На думку М. М. Крома, у канфліктах рода Мезецкіх, якія адбываліся ў другой палове 1490-х г., трэба бачыць заканамерны працэс, звязаны з разрастаннем княжацкага рода [6, с. 61]. Дамова стварала дэстабілізуючыя моманты, якія ўплывалі на сітуацыю ў родзе Мезецкіх. Такім чынам, другасным фактарам у канфлітках была сітуацыя, якая склалася пасля дамовы 1494 г. Ёсць звесткі аб іншых канфліктах на мяжы, якія адбываліся ў перыяд з 1494 па 1495 гг., але вельмі недакладныя [7, с. 147, 194–195]. Па-першае, адсутнічаюць храналагічныя маркеры дзякуючы якім падзеі можна датаваць. Па-другое, дакладна няма звестак аб тым куды і кім был здзейснены напады [7, с. 147, 194–195]. Хутчэй за ўсё гэтыя падзеі трэба адносіць да часоў вайны, якія ўзгадваліся падчас перамоў з палітычнай мэтай. Праўда, дакладна пацвердзіць гэта заключэнне нельга. Былі скаргі аб тым, што ў Вільне забіваюць і рабуюць баяр маскоўскага князя [7, С. 190–191]. Гэтыя звесткі не маюць пацвярджэнняў іншымі крыніцамі. Таксама падчас вайны 1500–1503 г. дадзеная інфармацыя не выкарыстоўвалася ў якасці абгрунтавання знешнепалітычнага курса. Улічваць таксама трэба і тое, што ў якасці прычына да вайны 1500–1503 г. называюць ганенні на праваслаўнае насельніцтва. Такім чынам, сапраўднасць інфармацыі аб забойстве праваслаўных баяр у ВКЛ трэба ставіць пад пытанне. Праўда, дакладна

ПолесГУ

адказаць на гэта пытанне нельга. У выніку летам 1495 г. абмен пасольствамі паміж ВКЛ і ВКМ перапыняецца.

Другі перыяд – 1496–1497 гг. У абазначаны час ідзе ўзрастанне канфрантацыі на мяжы, але пры гэтым самі канфлікты яшчэ вельмі нязначныя. Працягваліся канфлікты ў родзе Мезецкіх [7, с. 217]. Былі здзейснены напады на гарады і воласці, якія былі падначалены непасрэдна вялікаму князю. Скаргі прыходзілі ў 1496 г. з Мцэнска, Тарапца 7, с. 217]. Напады на Таропецкі павет і Мцэнскія тэрыторыі мелі грабежніцкі характар і не былі скіраваны на падрыў абароны ВКЛ. У 1497 г. можна адзначыць актыўнасць на памежных тэрыторыях прадстаўнікоў ВКЛ, якія нападалі на людзей разанскага князя [8, с. 236]. Акрамя гэтага ішла канфрантацыя паміж Сямёнам Іванавічам і Дзмітрыем Варатынскім [7, с. 232]. Гэты канфлікт можна інтэрпрэтаваць як асабістае памкненне князёў. Адзначым, што ў абазначаны перыяд пачынаюцца мытныя спрэчкі. Людзьмі Івана ІІІ былі ўведзены новыя мытныя пошліны для купцоў ВКЛ, якіх раней не было ў Вязьме [7, с. 229]. У 1497 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр накіраваў у Маскву ліст, у якім вельмі рэзка крытыкаваў палітыку Івана ІІІ і патрабаваў вярнуць захопленыя землі [7, с. 226]. Дадзенае паведамленне вельмі не тыповае па свайму тэксту для дыпламатыі ВКЛ у абазначаны перыяд. У ВКЛ не прапускалі паслоў з Асманскай дзяржавы ў ВКМ, што таксама ўносіла дэстабілізуючыя моманты ў адносіны дзяржаў [7, С. 219–226]. К. В. Базілевіч выказаў меркаванне, што сапраўдныя канфлікты паміж ВКЛ і ВКМ пачынаюцца менавіта ў 1497 г. [2, с. 322]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што памежныя канфлікты былі яшчэ нязначнымі. Трэба улічываць паведамленне Аляксандра, да Івана ІІІ у 1497 г., якое паказвае, што палеміка паміж ВКЛ і ВКМ была больш вострай у абазначаны перыяд.

Трэці перыяд ахоплівае час з 1498 г. і да пачатку вайны ў 1500 г. Можна казаць аб тым, што ў 1498 г. быў самы пік памежных канфліктаў. Адбывалася рабаўніцтва купцоў ВКЛ, на тэрыторыі Вязьмы санкцыянаванае Іванам ІІІ [7, с. 260]. Праўда трэба адзначыць, што дзейнасць людзей ВКМ было адказам на падзеі, якія адбываліся ў Смаленску. У 1498 г. Іван ІІІ аб'явіў, што "…мы городов и волостей и земель и вод твоих за собою не держим, а держим, з Божіею волею…" [7, с. 251]. Фактычна ішла ідэалагічная барацьба паміж дзяржавамі. Таксама ў 1498 г. адбыўся напад татар, якім магчыма кіраваў Міхаіл Плешчэеў [7, с. 251]. Скарга з боку Фёдара і Петра Мезецкіх – на уладанні якіх быў здзейснены напад пад кіраўніцтвам Сенкі Камыніна, з якім было яшчэ 30 чалавек [7, С. 246–247]. Гэты эпізод можна дакладна аднесці да канфлікту, які адбываўся не паміж рознымі галінамі князёў Мезецкіх. Напад быў арганізаваны князямі Акдырэеўскімі [7, с. 246]. Пры гэтым маштаб дзеянняў указывае на тое, што напад быў чыста грабежніцкім. Юрый Глебавіч намеснік смаленскі паведаміў, што князі Бялеўскія "…прислали многии люди войною…ко Мченску" [7, с. 268], а таксама нападалі на тэрыторыі і вёскі, якія належылі баярам мцэнскім. Было забіта "дватцать человеков…а иные и теперь лежать ранные" [7, с. 268]. Горад Мцэнск па дадзеных крыніц быў спалены. Хутчэй за ўсё сам горад не быў спалены, а пашкоджаны быў толькі пасад. Узялі ў палон намесніка мцэнскага Барыса Сямёнавіча, а таксама баярына Галуна, іншых баяр з жонкамі, чэлядзь, і "…людей на полторы тысячи душ головами звели…" [7, с. 267]. На дзень святога Пятра ў суботу баяры вяземскія – Сцяпан Паваадзін, Юрый Шэпакоў, а таксама Васіль Дзікі – напалі на тэрыторыю воласці Лучын, а дакладней на царкоўныя тэрыторыі. Абрабавалі простае насельніцтва "…и многие села пожгли…людей наших головами свели, а иных до смерти побили" [7, с. 268]. Таксама адбываліся напады каля Дзмітраўскай воласці, дзе былі заняты вёскі [2, с. 268]. Па звестках крыніц занята было 23 вёскі, але дакладна якія, не пазначаюцца [7, с. 268]. Ёсць меркаванне, што вайна была ўжо справай вырашанай у 1498 г. [2, с. 380; 9, с. 107; 5, с. 56]. Падчас перамоў у 1498 г. была прапанова падпісання новай дамовы. У жніўні 1499 г. з ВКЛ было адпраўлена пасольства, якое павінна было ўрэгуляваць адносіны дзяржаў [7, с. 280]. Спрэчныя пытанні так і не былі станоўча вырашыны. Трэба адзначыць, што менавіта ў 1499 г. у дакументах ВКЛ быў запісаны тытул Івана ІІІ "Государь всея Русии". Пытанне тытулатуры насіла вельмі

востры характар у адносінах паміж Вільняй і Масквой у перыяд з 1494 па 1500 гг. [9, с. 102]. Ускосна аб памкненні пачаць вайну з боку Івана ІІІ з ВКЛ нам паведамляе пасольская кніга з Крымам, у якой запісана, што "… на литовского и на Ахматовых детей с тобою заодин…" [8, с. 260]. За 1499 г. звестак аб памежных канфліктах няма. У канцы 1499 г. і да лютага 1500 г. людзьмі Івана ІІІ былі захоплены гарады Масальск, Сярпейск, Мцэнск і іх валасці [8, с. 204; 10, с. 143, 152]. Такім чынам, высновa У. І. Канановіча аб тым, што ў 1494 – 1500 г. былі буйныя памежныя кафлікты не зусім дакладна [5, с. 55]. Пэўным чынам на адносіны дзяржаў паўплываў знешнепалітычны фактар. У 1497 г. было падпісана перамір'е паміж ВКМ і Швецыяй [4, с. 108–109]. Такім чынам, гэта стварала спрыяльныя абставіны для ВКМ на заходнім напрамку.

У выніку можна сказаць, што перыяд з 1494 па 1500 гг., быў багатым на падзеі. Вырашаліся розныя спрэчныя пытанні, якія праўда насілі больш ідэалагічны напрамак. У канфліктах, якія адбываліся на мяжы, можна вылучыць пэўныя перыяды. Маштабныя канфлікты, можна прасачыць толькі пачынаючы з 1498 г. Памежныя канфлікты не маглі быць рэальнай прычынай вайны 1500–1503 гг. Яны ўносілі пэўны дэстабілізуючы момант, у адносіны дзяржаў. Рэальных нападаў, якія маглі пашкодзіць памежнай сістэме абароны не было. Пытанні звязаныя з праваслаўем, хутчэй насілі характар абгрунтавання знешняй палітыкі.


1. Акты, относящиеся к истории Западной России: в 5 т. / Сост. И.И. Григорович. – Санкт-Петербург: Типография II отд. Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1846–1853. – Т. 1: 1340–1506 / И.И. Григорович. – 1846. – 420 с.
2. Базилевич, К.В. Внешняя политика Русского централизованного государства Вторая половина XV в. / К.В. Базилевич. – 2-е изд. – М. : МГУ, 2001. – 541 с.
3. Духовные и договорные грамоты великих и удельных князей XIV–XVIвв. / подг. к печати Л.В. Черепнин. М.; Л. : Издательство: АН СССР, 1950. – 586 с.
4. Зимин, А.А. Россия на рубеже XV–XVI столетий (очерки социально-политической истории). / А.А. Зимин. – М. : Мысль, 1982. – 332 с.
5. Кананoвіч, У.І. Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага у 1480 - першай чвэрці ХУ1 ст.: (Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам) : дыс… канд. гіст. навук: 07.00.02 / У.І. Канановіч. – Мінск. – 1997.
6. Кром, М.М. Меж Русью и Литвой Пограничные земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. / М.М. Кром. – 2-е изд. – М. : Квадрига, 2010 г. – 320 с.
7. Сборник императорского Русского Исторического Общества: в 148 т. – Санкт-Петербург/Петроград, 1867–1916. – Т. 35: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. Т. 1: 1487–1533 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова. – 1882. – VI+XXII+869+88 с.
8. Сборник императорского Русского Исторического Общества: в 148 т. – Санкт-Петербург/Петроград, 1867–1916. – Т. 41: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымской и Нагайской ордами и с Турцией. Т. 1: 1474– 1505 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова. – 1884. – XXII+558+82 с.
9. Хорошкевич, А.Л. Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в. / А.Л. Хорошкевич. – М. :Наука, 1980 г. – 292 с.
10. Lietuvos Metrica - Lithuanian Metrica - Литовская Метрика. Kn.5: (1427-1506). / Parengė L. Anužutė. V.: Lietuvos istorjios instituto, 1994 m. – 403 p.


ПолесГУ